ISSN 2351-6658
ISSN (ONLINE) 2351-6666

# АГРАРНАЕ ПЫТАННЕ Ў ПРАГРАМАХ ЗАХОДНЕБЕЛАРУСКІХ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ ПАЛІТЫЧНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ (1921–1939 ГАДЫ)

**ВІТАЛЬ ГАРМАТНЫ**

***Анатацыя:*** У артыкуле распавядаецца пра падыходы заходнебеларускіх нацыянальных палітычных арганізацый у 1921–1939 гады да вырашэння аграрнага пытання, паказана яго актуальнасць для мясцовага насельніцтва.

***Ключавыя словы:*** палітычная партыя, сельская гаспадарка, аграрнае пытанне, зямля, сялянства.

# AGRARIAN QUESTION IN THE PROGRAM OF WESTERN BELARUSIAN NATIONAL POLITICAL ORGANISATIONS IN 1921–1939

***Abstract:*** The article discusses the approaches of Western Belarus national political organizations to the resolution of agrarian question in 1921–1939. It shows the importance of this problem for the local population.

***Keywords:*** Political Party, Agriculture, Agrarian Question, Land, Peasants.

Пасля заключэння Рыжскага міру ад 18 сакавіка 1921 года Заходняя Беларусь увайшла ў склад Другой Рэчы Паспалітай (міжваеннай Польшчы). На 1921 год каля 64% жыхароў Польшчы было занята ў сферы сельскай гаспадаркі, а адносна Заходняй Беларусі гэты паказчык складаў прыкладна 90% (Зелинский1986: 7). Сялянская гаспадарка Заходняй Беларусі была амаль цалкам разбурана падчас Першай Сусветнай і Савецка-польскай (1919–1921 гады) войн. Вялікія разбурэнні назіраліся і ў карэннай Польшчы, але Заходняя Беларусь пацярпела найбольш за іншыя рэгіёны міжваеннай польскай дзяржавы. Рэгіён быў адарваны ад сістэмы агульнарасійскіх эканамічных і вытворчых адносін, усерасійскага рынку, што не магло не адбіцца адмоўна на развіцці яго эканомікі.

Шматлікія тагачасныя палітычныя партыі прапаноўвалі свае варыянты вырашэння аграрнага пытання, імкнучыся схіліць сімпатыі сялян на свой бок. Сярод заходнебеларускіх нацыянальна-вызваленчых палітычных арганізацый у 1921–1939 гады неабходна асабліва адзначыць Беларускую Хрысціянскую Дэмакратыю (БХД, хадэкі), Беларускую Сялянска-Работніцкую Грамаду (БСРГ) і Беларускі Сялянскі Саюз (БСС).

На думку аўтараў праграмы **БХД,** прыватная ўласнасць (у тым ліку і на зямлю) з'яўляецца асноваю любога цывілізаванага грамадства, аднак хадэкі выступалі за яе абмежаванне і дэкларавалі неабходнасць пераходу буйной уласнасці ў калектыўнае карыстанне. У аснову праграмы хрысціянскіх дэмакратаў было пакладзена сцвярджэнне, што беларускі народ з`яўляецца бяскласавым і цалкам працоўным ("сярмяжным") (Вашкевіч 2006: 34–35), у сувязі з чым адмаўлялася магчымасць канфліктаў унутры заходнебеларускага сялянства.

У дыскусіях адносна тагачаснага сялянскага землекарыстання ў Заходняй Беларусі БХД займала выразна акрэсленую пазіцыю падтрымкі польскай урадавай палітыкі камасацыі (аб'яднання раскіданых сялянскіх надзелаў) пры ўмове папярэдняй згоды сялян і абавязковай дапамогі ім з боку дзяржавы. Як адзначалі лідары партыі, "БХД змагаецца за такое ўпарадкаванне зямлі і за такую зямельную гаспадарку, якая давала б найбольш прыбытку грамадству і дзяржаве. Такою гаспадаркаю БХД лічыць працу на хутарах ці на супольных зямельных надзелах (водрубах)" (Экономическая мысль, 2004: 87). Зямля перадавалася сялянам па працоўнай норме, якая залежала ад таго, колькі мог апрацаваць гаспадар са сваёй сям'ёй ці пры дапамозе 1–2 сельскагаспадарчых рабочых (звычайна 10–15 га, пункт 39 праграмы 1928 год, 1932 год), але наёмныя рабочыя дапускаліся толькі пры ўмове старасці, хваробы, калецтва ці ўдаўства гаспадароў зямлі.

У праграме **БСРГ** ад 12 мая 1926 года, складзенай Браніславам Тарашкевічам і яго паплечнікамі, па аграрным пытанні галоўнымі

мэтамі ставіліся канфіскацыя памешчыцкіх і царкоўных зямель, пераход іх ва ўласнасць дзяржавы і падзел без выкупу паміж мясцовамі сялянамі і парабкамі, скасаванне інстытута асадніцтва і гэтак далей. У праграме БСРГ адзначалася, што толькі цесны саюз сялян і рабочых (“работнікаў”) можа ўсталяваць сялянска-рабочы ўрад, які зможа даць сялянам зямлю і “перабудаваць народную гаспадарку і ўвесь дзяржаўны і грамадскі лад на больш разумных і справядлівых падставах ды павясьці народ да лепшае будучыні” (Праграма, 1926: 4–6).

У цэлым БСРГ стаяла за развіццё індывідуальных сялянскіх гаспадарак, падтрымлівала ўрадавую палітыку камасацыі, за што падверглася рэзкай крытыцы з боку Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі: “Асабліва яскрава выражаны кулацкі ўплыў на праграму Грамады ў пункце аб землеўпарадкаванні, дзе ёсць патрабаванне камасацыі…, чым фактычна змазваецца пытанне барацьбы за зямлю без выкупу і супрацьпастаўляецца калектывізацыі сялянства ў Сав. Саюзе як адзінаму шляху да выхаду сялянства з галечы, у якой яно марнее цэлыя вякі” (НАРБ, Спр. 101). Варта падкрэсліць, што Грамада адмаўляла дыктатуру пралетарыяту, абгрунтоўваючы гэта наступным чынам: “Беларусь край аграрны. Сяляне складаюць найвялікшую большасць усяго жыхарства… Работнікі складаюць 0,2 проц. у адношаньні да ўсяго жыхарства. Ясна, што пры гэткай соцыяльнай клясавай структуры Беларусі зусім *ня можа быць ніякай гутаркі аб якойсьці там дыктатуры пралетарыяту”* (курсіў у арыгінале) (НАРБ, Спр. 65).

Аграрная праграма **БСС** прадугледжвала падзел памешчыцкіх зямель і перадачу іх у прыватную ўласнасць малазямельных сялян па працоўнай норме, скасаванне інстытута асадніцтва. Кіраўніцтва БСС выступала за надзяленне малазямельных і беззямельных сялян зямлёю без выкупу, бо зямля не з’яўляецца таварам, таму што не створана чалавечаю працаю і з’яўляецца ўласнасцю ўсяго народа. Лідары БСС абгрунтоўвалі неабходнасць пераходу заходнебеларускіх сялян на хутарскую форму вядзення асабістай гаспадаркі і звязвалі гэта з перавагаю малых форм вытворчасці ў сельскай гаспадарцы.

У 1926 годзе кіраўніцтвам БСС распрацаваны і накіраваны ў Савет Міністраў міжваеннай Польшчы мемарыял (праект) па пытанні ўздыму вытворчых сіл заходнебеларускай вёскі, дзе прапаноўвалася цэласная праграма перабудовы аграрных адносін. Найбольш абгрунтаванымі прапановамі мемарыяла сталі наданне сялянам доўгатэрміновых банкаўскіх крэдытаў, правядзенне аграрнай рэформы з прадастаўленнем сялянам зямлі, арганізацыя вопытных даследчыцкіх сялянскіх станцый, улічванне пры правядзенні камасацыі патрэб малазямельных сялян праз прадастаўленне ім неабходнага мінімуму зямлі

і інвентара для магчымасці вядзення самастойнай гаспадаркі, а пры ліквідацыі сервітутаў захаванне сялянскіх правоў з магчымасцю іх наступнага выкарыстання (Экономическая мысль, 2004: 83–84).

На Другой канферэнцыі БСС (ліпень 1927 года) прысутнічала 35 чалавек (з іх 22 – дэлегаты ад усіх заходнебеларускіх паветаў, акрамя Лунінецкага і Пінскага). Васіль Рагуля выступіў з дакладам па аграрным пытанні, пасля чаго была прынята адпаведная праграмная рэзалюцыя. У праграме адзначалася, што “ўсе нетрудавыя землі: абшарніцкія, дзяржаўныя, касцёльныя, царкоўныя і іншыя – павінны перайсці ў рукі беларускіх беззямельных і малазямельных сялян” (пункт 3), а працоўная норма ўяўлялася тыпам самастойнай хутарской гаспадаркі (пункт 7).

Такім чынам, заходнебеларускія палітычныя арганізацыі ў 1921–1939 гады мелі на мясцовае сялянства даволі вялікі ўплыў, надавалі вырашэнню аграрнага пытання асаблівае значэнне, усяляк падкрэслівалі неабходнасць надзялення зямлёю сялян Заходняй Беларусі і аказання ім як мага большай дапамогі з боку польскага ўрада (перш за ўсё выдачы льготных крэдытаў). Найбольш радыкальнай па аграрным пытанні была праграма БСРГ, якая патрабавала перадачы сялянам усёй памешчыцкай зямлі, больш умеранымі былі патрабаванні БСС і БХД, што абаранялі ў першую чаргу інтарэсы заможнага сялянства і выступалі з адпаведнымі праектамі ажыццяўлення аграрных пераўтварэнняў.

### *Бібліяграфія*

1. Зелинский, П. И. (1986). *Политическая работа КПЗБ в массах, 1923–1938 гг.* Минск: Университетское.

2. Вашкевіч, А. Ф. (2006). “Эвалюцыя Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі ў святле яе палітычных праграмаў (1917–1939 гг.)”, *Спадчына,* №1: 22–35.

3. *Материалы об экономическом положении Западной Белоруссии, экономическом, национальном и политическом гнете польского правительства на Западной Белоруссии. Статья Кузнецовой о Громаде и др.* Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ), Ф. 242п, воп. 1, спр. 101, арк. 121.

4. *Статьи и вырезки из газет по партийно-марксистскому анализу и характеристике Громады.* НАРБ, Ф. 242п, воп. 1, спр. 65, арк. 3.

5. *Праграма і арганізацыйны статут Беларускай сялянска-работніцкай грамады* (1926). Вільня: Выдаўніцтва Цэнтральнага сакратарыяту Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады.

6. *Экономическая мысль Западной Беларуси в 1921–1939 гг.* (2004). Минск: Право и экономика.